# ПАРТРЭТЫ ФІЛАМАТАЎ ВА «УСПАМІНАХ ПРА МІНУЛАЕ» А. Э. АДЫНЦА

Пісьменніцкія ўспаміны даследчыкі вылучаюць у асобнае жанравае ўтварэнне мемуарнай літаратуры, бо гэта не толькі зафіксаваныя каштоўныя сведчанні, факты і эпізоды літаратурнага жыцця, арганізаваныя і інтэрпрэтаваныя паводле аўтарскай канцэпцыі і асабістых уяўленняў. Найперш гэта па-мастацку аформленае эмацыянальнае пражыванне былога творцам, які глядзіць на яго з гістарычнай адлегласці і намагаецца сваёй памяццю аб'яднаць старыя ўражанні і сучаснае бачанне мінулых падзей.

Да мемуараў А. Э. Адынца «Успаміны з мінулага» («Wspomnienia z przeszłości»), напісаных аўтарам у 1884 годзе, неаднаразова звярталіся гісторыкі літаратуры. Сапраўды, мемуарны твор Адынца – найбагацейшая крыніца інфармацыі пра жыццё і творчасць паэтаў філамацкага кола,

культурную атмасферу ў Літве-Беларусі 20-х гадоў XIX стагоддзя. Аўтар дакладна і разам з тым вобразна аднаўляе літаратурны асяродак Вільні тых слаўных часоў, калі *ў кожным доме было па паэце*, але ідзе і далей у часе: малюе постаці выбітных пісьменнікаў варшаўскага асяродку, з якімі давялося таварышаваць, апісвае ўнікальную сітуацыю ў Дрэздэне, дзе пасля паразы Лістападаўскага паўстання сабраліся многія знаныя літаратары.

Антоні Эдвард Адынец бярэцца за апісанне падзей мінулага як вопытны пісьменнік і мемуарыст. У яго «Успамінах» выяўляецца такі надзвычай важны сацыяльна-псіхалагічны аспект мемуарнага тэксту, як мэтавая скіраванасць на чытача, зацікаўленага ў спасціжэнні літаратурнага працэсу, на будучага гісторыка літаратуры. Важнасць пісьменніцкіх мемуараў адзначалі і варшаўскія сябры-літаратары А. Э. Адынца, Вінцэнт Поль і Казімір Брадзінскі, што, напэўна, схіляла яго да думкі калі-небудзь звярнуцца да часоў сваёй творчай маладосці. Так, К. Брадзінскі лічыў грамадзянскім абавязкам пакінуць асабістыя праўдзівыя звесткі аб літаратурным пераломе ад класіцызму да рамантызму. Пісьменнік падкрэсліваў каштоўнасць такіх успамінаў, *лічачы іх за найбольш дапаможны сродак для знаёмства і разумення сапраўднага аблічча эпохі і асобных людзей* [1, с. 230]. Недахоп падобных мемуарных твораў ён тлумачыў гістарычным бяспамяцтвам, якое пазбаўляе айчынную літаратуру арыгінальных твораў падобнага кшталту і прымушае следаваць іншаземным узорам.

Мемуарыстыка з’яўляецца адным са сродкаў духоўнай пераемнасці пакаленняў. А. Э. Адынец успамінамі ўваскрашаў падзеі 60-гадовай даўніны, а сам ён у вачах сучаснікаў паўставаў як жывая гісторыя, адзін з апошніх сведкаў і непасрэдных удзельнікаў пераломнага працэсу. Нягледзячы на тое, што літаратурнае атачэнне А. Э. Адынца схіляла яго *да апісання жыцця Міцкевіча*, пісьменнік адчуў патрэбу на схіле жыцця вярнуцца ўспамінамі ва ўласную філамацка-філарэцкую маладосць і з адлегласці часу асэнсаваць унікальнасць тагачаснага асяродку віленскага студэнцтва, паказаць назапашаны велізарны духоўны і творчы патэнцыял, які будзе разгортвацца на працягу наступных дзесяцігоддзяў у літаратурным і грамадскім жыцці краіны: *Хачу пераказаць некаторыя дэталі і ўспаміны пра сяброў-паэтаў, таварышаў жыцця і працы ў пераломную эпоху нашай паэзіі, якія датычаць выключна і толькі паэзіі* [1, с. 33].

Свядомую скіраванасць на суб’ектывізм аўтар падкрэслівае ў прадмове, гаворачы, што прапанаваныя запіскі не гістарычныя ці літаратурныя даследаванні; не дакладныя біяграфіі некаторых асоб, а толькі выключна яго ўласныя ўспаміны пра сяброўскія і прыяцельскія стасункі ў штодзённым жыцці, *якімі будучы гісторык або мастак эпохі зможа або ўжо можа карыстацца настолькі, наколькі вайсковы стратэг, апісваючы нейкія падзеі,*

*карыстаецца аповедамі простага жаўнера, які сам удзельнічаў у іх і герояў гэтых падзей бачыў на ўласныя вочы* [1, с. 33]. Аднаўляючы ў сваіх мемуарах постаці сяброў і знаёмых, прыгадваючы асабістыя стасункі і эпізоды з рэальнага жыцця, А. Э. Адынец стварае яркія замалёўкі жыцця інтэлігенцыі, творчай эліты, шырокую панараму літаратурнага і прыватнага жыцця Вільні і Віленшчыны.

Суб'ектыўнасць з'яўляецца структурна-арганізуючым прынцыпам мемуарнага тэксту, аднак, як адзначаюць даследчыкі, «функцыя мемуараў заключаецца ў задавальненні патрэбы ў індывідуалізаванай і дакладнай гістарычнай інфармацыі» [2, с. 21]. Адынец неаднаразова будзе сцвярджаць у мемуарах, што мае на мэце перадаваць толькі ўласныя ўспаміны і ўражанні, тым не менш на пачатку твора ён заручыўся лістом ад І. Дамейкі, які чытаў урыўкі мемуараў раней і засведчыў, што твае *"Успаміны пра мінулае" ёсць дакладнымі, уваскрашаюць людзей і падзеі наўпрост, як было* [1, с. 36].

У мемуарах Адынец абірае сабе ролю рэальнага наратара, які распавядае свае ўспаміны Дыятыме – пад гэтым псеўданімам выступала Ядвіга Лушчэўская (1834–1908), вядомая сваім імправізатарскім талентам паэтка і навелістка. Прыём непасрэднага звароту да імпліцытнай слухачкі, якую ён называе не інакш як «сястра» або «сястрычка», прадстаўніцы іншага літаратурнага пакалення, дазваляе А. Э. Адынцу злучыць час сваёй маладосці з рэальным часам стварэння мемуарнага тэксту і разам з тым адасобіць сябе як наратара, які набывае незалежнае фізічнае існаванне, ад сябе самога ў якасці аўтабіяграфічнага героя. Пісьменнік выразна адчувае вялізарную адлегласць часу, пры якой адбылася змена літаратурнай парадыгмы, светапоглядныя і эстэтычныя зрухі. Таму аўтар дапускае частыя крытычныя выпады і палемічныя выказванні, супастаўляючы прыярытэты сваёй пісьменніцкай маладосці, часу *рамантычнай сувязі сэрцаў і духу*, з пазіцыямі актуальнага ў 80-я гады пазітывізму. Можна сказаць, што сама сітуацыя актыўнага сцвярджэння новых стандартаў пазітывізму і рэалізму ў культуры і ў ладзе жыцця, якія былі відавочна чужымі для А. Э. Адынца, з'явілася для яго пабуджальнай, каб акунуцца ўспамінамі ў пару рамантычнай узнёсласці і непаўторнага сяброўскага братэрства.

Функцыя наратара-апавядальніка, які мае на ўвазе найперш канкрэтнага адрасата-слухача, дазваляе аўтару спантаннасць успамінаў, адыход ад храналагічнай лініі, суб'ектыўнасць ацэнак, засяроджанасць на дэталях асабістага жыцця, якія ўзнаўляюць атмасферу часу, магчымасць некалькі разоў вяртацца да аднаго і таго ж эпізоду, па-рознаму яго эмацыянальна асвятляючы: *Бачу, што зноў будзе яшчэ адно адступленне! Але даруй мне, сястрычка, што не магу ад яго ўстрымацца, тым больш, што лічу гэта цікавым дадаткам да тэмы, пра якую распавядаю* [1, с. 132]. Узнаўляючы перарваную нарацыю, аўтар штораз адзначае, што не лічыць абавязковым трымацца парадку.

У мемуарах, якія з'яўляюцца мастацкім увасабленнем індывідуальнай памяці, як правіла дамінуе ўстаноўка на аповед або пераважна пра сябе, або пераважна пра «іншага» ў шырокім сэнсе, маючы на ўвазе асобы, падзеі, гістарычныя з'явы. На пачатку мемуарна-біяграфічны твор А. Э. Адынца выразна суб'ектна арыентаваны і інтравертны: аўтар распавядае пра ўражанні дзіцячых гадоў, пра вучнёўства ў школе ў Барунах, пра школьных сяброў і настаўнікаў.

Для многіх мемуарыстаў першаснымі з'яўляюцца ўспаміны пра дзяцінства як аб часе станаўлення асобы, і Адынец таксама распавядае пра фарміраванне свайго разумовага і маральна-этычнага досведу. Ён гаворыць пра сябе, але можна меркаваць, што на прыкладзе ўласнага дзяцінства, якое выглядае досыць тыповым, пісьменнік дае магчымасць зразумець асаблівасці выхавання і фарміравання духоўнага ўзроўню ўсяго ягонага пакалення. Спачатку моладзь гадавалася ў атмасферы бацькоўскага дому, дзе панавалі прастата нораваў, добразычлівасць, шчырасць, гасціннасць, а потым набывала адукацыю ў школах Літвы-Беларусі, навучанне ў якіх мела выразны маральна-рэлігійны характар. На думку А. Э. Адынца, менавіта такая скіраванасць школ, дзе набывалі пачатковыя веды будучыя навучэнцы Віленскага ўніверсітэта, абумовіла і падрыхтавала нараджэнне ў яго асяродку рамантызму, які варта разглядаць не толькі мастацкай, але найперш духоўнай, светапогляднай з'явай. Вось што піша аўтар: *Тыя рэлігійныя школы звычайна пастаўлялі ў Віленскі ўніверсітэт найстараннейшых і наймаральнейшых вучняў; і сам той чысты, узнёслы, эстэтычны кірунак, і духоўны настрой, які развіўся ва ўніверсітэце і з якога потым расцвіла наша новая паэзія, сваім зараджэннем абавязаны былі вучням падобных школ* [1, с. 46]. А. Э. Адынец дазваляе сабе сюжэтныя ўстаўкі, у якіх апавядае пра далейшы лёс некаторых выпускнікоў школы ў Барунах, якія не будуць належаць да віленскага студэнцтва, але праявяць сябе цікавымі і неардынарнымі асобамі.

У Барунах завязалася сяброўства з Людвігам Шпіцнагелем, Леанардам Ходзькам, з якім у маленстве неяк так пабіліся, што ў Ходзькі на ўсё жыццё паміж вачыма застаўся белы шнар, з Антонам Фрэентам, вядомым потым філамацкім ямбапісцам. Менавіта трохі старэйшы Фрэент прывядзе Адынца на маёўку філарэтаў падчас Зялёных Святак 1820 г., дзе ён упершыню пабачыць Т. Зана, Я. Чачота і пачуе імя А. Міцкевіча. *Раніцу таго дня не забуду ніколі…На чале шматлікай кампаніі ішоў юнак, якому было дваццаць з лішнім гадоў, з валасамі колеру крумкачынага крыла, якія віліся кольцамі, з чорнымі, сапраўды прамяністымі вачыма; усмешка і твар якога свяціліся такой далікатнай дабрынёй, што адразу хапала за сэрца. Побач з ім ішоў хлопец ніжэйшы ростам, хоць крыху старэйшы па ўзросце. На яго фізіяноміі таксама адлюстроўвалася дабрыня, толькі не такая вясёлая і жывая, не так прамяністая вонкава, а нібы ўсмешка сентыментальнай пяшчоты.*

*Абодва яны, было відаць, верхаводзілі над усімі. Гэта былі Тамаш Зан і Ян Чачот* [1, с. 70–71]. Тады ж завязалася знаёмства з Юзэфам Кавалеўскім, Янам Вернікоўскім, Адамам Сузіным, Ігнатам Дамейкам (бацькі абодвух здаўна знаходзіліся ў добрым сяброўстве).

Пачынаючы з трэцяй часткі «Універсітэцкія часы» мемуары набываюць больш экстравертны характар, становяцца аб'ектна-арыентаванымі. Найчасцей А. Э. Адынца цікавяць іншыя – выбітныя асобы сяброў-філаматаў, паэтаў або проста цікавыя постаці, але ў адносінах з ім і ягонымі аўтарскімі вачыма. Пісьменнік актыўна дэманструе сваю асаблівую ролю ў прыгаданых падзеях, ахвотна дзеліцца ўласнымі ўражаннямі, падкрэсліваючы іх асобасны характар. Варта заўважыць, што аўтар паказвае постаці знаёмых і сяброў або падзеі, нават самыя неадназначныя, заўсёды пазітыўна, з нязменнай сімпатыяй, што найперш тлумачыцца лёгкім і неканфліктным характарам самога Адынца, які з дзяцінства меў мянушку Beniaminek – Пястунчык, Любімчык.

Антоні Адынец апісвае ўнікальную атмасферу, якая панавала ў Віленскім універсітэце ў перыяд яго, бадай, самага вялікага росквіту. Як адзначыла Л. Хмяльніцкая, на пачатку XIX стагоддзя Віленскі ўніверсітэт «хутка стаў найбуйнейшым не толькі ў Расіі, але і ў Еўропе і да 1823 г. па колькасці студэнтаў пераўзышоў Оксвардскі ўніверсітэт» [2, с. 38]. Пісьменнік адзначае ўнікальнае спалучэнне ў адным месцы выключных выкладчыкаў і выключных студэнтаў, што ў выніку дало свой плён: *Грамадзянскі запал таленавітых прафесараў памножыўся на запал і энтузіязм студэнтаў, духоўны настрой і паводзіны якіх, можна смела сказаць, ані да таго, ані пасля не мелі сабе роўных у ніводным універсітэце Еўропы. Да гэтага спрычыніліся галоўным чынам сяброўскія і таварыскія аб'яднанні пад кіраўніцтвам Зана і Чачота* [1, с. 77]. Такім чынам аўтар адразу акрэслівае дамінуючыя постаці сваіх успамінаў і кажа, што нават калі будзе пісаць пра сябе і пра іншых паэтаў, то ўсё роўна будзе пісаць пра Т. Зана і Я. Чачота. Гэта былі асобы, якія вялі рэй у творчым і духоўным жыцці віленскага студэнцтва і аказалі наймацнейшы ўплыў на фарміраванне асобы аўтара, які знаходзіўся з імі ў блізкіх стасунках. Постаці Чачота і Зана чырвонай ніткай пройдуць праз усе мемуары Адынца, пераплятаючыся з постаццю А. Міцкевіча, успамінамі пра першае знаёмства з ім і частыя сустрэчы да самага яго ад'езду з Вільні ў 1824 годзе. Можна сказаць, што многія звесткі з мемуарна-аўтабіяграфічнага твора А. Э. Адынца сталі хрэстаматыйнымі, растыражаванымі, перайшлі ў падручнікі і манаграфіі, сталі базай для навуковых даследаванняў.

Так атрымалася, што многія важныя падзеі віленскага літаратурнага жыцця і біяграфіі аўтара супадалі. Пра іх Адынец апавядае падрабязна і эмацыянальна. Сярод такіх эпахальных – 1 лістапада 1820 г, калі адбылося яго прыняцце да Błękitnego Grona. За «кума» быў Антон Фрэент, а прымалі яго

разам з Мікалаем Маліноўскім, будучым гісторыкам і таксама мемуарыстам. Пасля кароткага ўрачыстага рытуалу неафіты далучыліся да *«Poet's Corner»*. *Poet's Corner (кут паэтаў), як выразіўся Фрэент (намякаючы на так званае месца ў Вестмінстэрскай кафедры ў Лондане), быў менавіта на куфэрках каля печы, дзе я адразу ўбачыў усіх ужо знаёмых мне па лекцыйных залах таварышаў… О! Каб ты магла ўявіць, сястрыца, як я сам, здаецца, бачу перад сабой, на тых двух куфэрках каля печы бадзёрых маладых юнакоў, якім ад 16 да 20 гадоў, яны ўзрушаны хвалюючым момантам, перашэптваюцца і абменьваюцца жартамі, то перад вачыма ты мела б увесь малады тагачасны наш Віленскі ўніверсітэцкі Парнас* [1, с. 96]. Далей А. Э. Адынец працягвае дастаткова крытычна, гаворачы, што большасць з іх так і не ўзляцела высока ў паэзіі, *некаторыя пагаслі нават перад тым, як заззяць, іншым бура паламала крылы, іншым, як, напрыклад, мне, не хапала сіл для вышэйшага палёту*, але нязменным было пачуццё захаплення паэзіяй, энтузіязм, смеласць, жаданне і надзея на славу. Так атрымалася, што дзень прыняцця аўтара ў кола Блакітнага саюзу быў для яго разам з тым і паваротным пунктам ад класічнай французскай паэзіі да новых даляглядаў пад назвай «рамантычнасць».

У канцы гэтага пасяджэння Я. Чачот прачытаў тры балады А. Міцкевіча: «Курганок Марылі», «Свіцязь» і «Свіцязянка». Ураджанні ад гэтага чытання помняцца аўтарам і праз гады: *Але як табе, сястрыца, апісаць хваляванне, якое ахапіла слухачоў, асабліва пасля прачытання ў канцы «Свіцязянкі»? Праз шэсцьдзясят гадоў сёння я яшчэ адчуваю, здаецца, і памятаю ўсё як учора. Без перабольшання і дакладна магу сказаць, што чуваць было біццё сэрцаў – такая стаяла цішыня, і як былі ўражаныя прысутныя* [1, с. 98]. Такім чынам, гэты дзень быў знамянальным не толькі для маладога Адынца, але і для развіцця рамантызму. Неаднаразова пісьменнік будзе вяртацца да апісанняў сходак Блакітнага саюзу, кутка паэтаў, які месціўся на двух куфэрках ля печкі. Адынец піша, што гэта было *нібы агменем жывой паэзіі*, і параўноўвае філарэцкую паэтычную моладзь з электрычнымі зарадамі ў дузе Вольта, у якой кожны ў сукупнасці з іншымі памнажаў агульную сілу [1, с. 111]. З крыўдай А. Э. Адынец адзначае, што ніхто з варшавянаў, ні літаратараў, ні проста падарожнікаў за ўвесь час росквіту Віленскага ўніверсітэта не зазірнуў сюды хоць на хвіліну, хоць дзеля цікавасці: што гэта за гняздо новай паэзіі, смелых літаратурных навацый, розгалас аб якіх разыходзіцца па ўсёй культурнай прасторы былой Рэчы Паспалітай.

Аўтар распавядае пра агульны эмацыянальна-паэтычны ўздым Вільні ў тыя часы, эпіцэнтрам якога быў універсітэт. Жанчыны вызначаліся сентыментальнасцю і чуллівасцю, мужчыны – сармацкім духам, а ўплыў універсітэта разыходзіўся далёка за межы Віленшчыны. Такі творчы пад'ём, усеагульная зацікаўленасць літаратурай нарадзілі масавую паэзію, якая

пісалася ў шляхецкіх сядзібах і вызначалася розным мастацкім узроўнем. З аднаго боку, Адынец называе імя графамана і літаратурнага праныры Вінцэнта Кішкі-Здзерскага, якога пакусваў сваімі вершамі-жартамі І. Шыдлоўскі. Але з шэрагу паэтаў-дылетантаў выйшлі і такія творцы, як Ян Ходзька, Казімір Буйніцкі, урэшце, Ігнат Ходзька. Сярод правінцыйных аўтараў асобнай увагі заслужыла арыгінальная постаць Тэклі Урублеўскай. Яе сваяк, Людвіг Папроцкі не раз забаўляў сяброў аповедамі пра яе дзівацтвы. Т. Урублеўскую, добразычлівую і гасцінную, шанавалі і любілі, апроч, мабыць, Л. Бароўскага, які павінен быў чытаць перад друкам яе творы. Такая крэатыўная атмасфера вызначала высокі этычна-эстэтычны ўзровень, фарміравала багаты літаратурна-мастацкі патэнцыял, што прывяло да выніку – прыходу ў літаратуру генія А. Міцкевіча. Пісьменнік прыводзіць трапнае і вобразнае параўнанне масавай паэтычнай творчасці са шчэбетам птаства перад блізкім узыходам сонца або з пробным пускам балонікаў перад запускам паветранага шара [1, с. 104].

Аўтар прысутнічае ва «Успамінах» і як адзін з герояў твора, маладзенькі студэнт, паэт-пачатковец, добры і зычлівы сябра, і як апавядальнік, чыя прысутнасць праяўлена ў каментарах, заўвагах, разважаннях, лірычных адступленнях, якія складаюць значную частку тэксту. Такім чынам асобы філаматаў ды і іншыя знакавыя постаці таго часу асветлены стэрэаскапічна, аб’ёмна, не толькі праз бягучыя падзеі тагачаснага жыцця, але і праз пазнейшыя іх перажыванні аўтарам. Нягледзячы на багацце фактычнага матэрыялу, наяўнасць белетрызаваных фрагментаў, успаміны Адынца не столькі сюжэтна-падзейныя, колькі апісальныя і ўспамінальна-рэфлексіўныя. Менавіта з гэтага спалучэння аб’ектыўнага і суб’ектыўнага складаецца сукупны партрэт той ці іншай постаці. Вобразы паэтаў-філаматаў у тэксце пераплецены, паказаны ў сяброўскіх узаемадачыненнях паміж сабой, непарыўна звязаны з літаратурнай творчасцю і філамацкім рухам, які шмат у чым прадвызначыў іх будучыню. Сярод герояў «Успамінаў» Л. Шпіцнагель, А. Фрэент, Я. Вернікоўскі, М. Маліноўскі, Ф. Кулакоўскі, Ю. Масальскі і мноства іншых, якія не ўваходзілі ў склад Таварыства, але тым ці іншым чынам кантактавалі з філаматамі, уплывалі на іх лёсы і творчасць. Варта назваць А. Гарэцкага і тады яшчэ падлетка Ю. Славацкага, паняў Балінскую і Бецю, Залескую і Гарэцкую. Цікавыя апісанні дома Кавальскіх у Коўна, аб якіх у Адынца засталіся самыя цёплыя ўражанні, маладой сям’і Ваўжынца і Марылі Путкамераў. Пра іх аўтар таксама пакідае характарыстычныя замалёўкі, арганічна ўплеценыя ў мемуарны сюжэт «Успамінаў».

Партрэты філаматаў паўстаюць з сукупнасці калейдаскапічных апісанняў і аўтарскіх ўражанняў па меры знаёмства з тэкстам, але мемуарыст часам дазваляе сабе эсэістычныя ўстаўкі, дзе больш буйным планам вылучае постаці блізкіх сяброў. З глыбокім лірызмам Адынец успамінае Юліяна

Корсака, з якім яго лучыла нібыта містычная сувязь, бо Корсак заўсёды аказваўся побач, калі аўтару патрэбна была дапамога. Шмат старонак аддадзена ўспамінам пра Ігната Дамейку, Аляксандра і Ігната Ходзьку. Як ужо адзначалася, аўтар дазваляе сабе шматлікія адступленні і парушэнні храналагічнай паслядоўнасці, інверсіі і перамяжэнні часавых пластоў. Так, Адынец прыгадвае, што ўпершыню пачуў слова «рамантычнасць» менавіта ад А. Ходзькі. У сваёй творчасці ён, любімы вучань Зана, з самага пачатку праявіў сябе як рамантык, у той час як многія старэйшыя за яго паэты, па словах Адынца, усё яшчэ хадзілі ў рымскіх тогах або ў французскіх гафтаваных фраках. Яго балада «Маліны» натхніла Ю. Славацкага на напісанне «Баландыны». Адынец перад гэтымі радкамі ўжо ўваскрашаў у памяці шматлікія эпізоды, звязаныя з сябрам, і ад пачатку адзначаў, што Аляксандр Ходзька быў яго першым у Вільні знаёмцам-паэтам. Пісьменнік звяртаецца да Дыятымы з напамінам пра фотаздымак, які А. Ходзька, прафесар славянскай літаратуры, нядаўна даслаў яму з Парыжа ў гонар свайго 75-годдзя. З белай паважнай барадой ён выглядаў, як усходні мудрэц, *але тады быў стройны, складны, з далікатнай дзявочай скурай і прыгожы, як паненка, юнак* [1, с. 88].

Успаміны пра тую ці іншую асобу нярэдка дапаўняюцца інфармацыяй з часу, калі зямны шлях большасці сяброў-філаматаў ужо завершаны, і Адынцу пасля аповеду пра іх лёс давялося падагульняць свае пачуцці ў эпітафіях на іх магілы. *Сумная гэта справа і нават нелагічная па сэнсе – прыводзіць найперш надмагільны надпіс чалавека, а затым пачынаць гаварыць пра першае знаёмства з ім. Аднак гэта звычайная чарга маіх думак пры напісанні гэтых аповедаў*, – так аўтар нібыта выбачаецца за пэўную інверсію ва ўспамінах пра знаёмства з В. Путкамерам [1, с. 179].

Лёс даў А. Э. Адзінцу доўгае жыццё. Ён перажыў большасць сваіх сяброў і занёмых. На старасці гадоў ягоны хранатоп спусцеў, таму, натуральна, успаміны часта элегічныя і афарбаваны настальгіяй па часах такой багатай на яркія падзеі і выбітных сяброў маладосці. *На весялейшае зараз падае цень магілы, наймілейшае парой канчаецца слязьмі. Памяць уваскрашае і бачыць, што было, але сэрца тут жа адчувае, што гэтага ўжо няма, і, што яшчэ горш, ведае, што з гэтым сталася,* – такімі словамі завяршае аўтар успамін пра шляхетную і пакутніцкую постаць свайго добрага сябра Адольфа Янушкевіча, жыццёвы шлях якога аўтар пераказаў ад студэнцкіх гадоў да смерці [1, с. 118]. Асобу настолькі высакародную і дабрачынную, што, на думку аўтара, павінна стаць аб'ектам высокай паэзіі. Нязменна А. Э. Адынец падкрэслівае высокі маральны і духоўны ўзровень сваіх сяброў, скіраванасць іх творчасці *да любові, годнасці і прыгажосці, веры ў Праўду, Справядлівасць, Наканаванасць. Тыя ж, хто не захаваў следу*

*тых пачуццяў, не выказаў іх у сваіх творах, выказваў іх і атрымліваў назад праз сяброўскія і братэрскія стасункі і ўзаемную братэрскую зычлівасць* [1, с. 111]. Пісьменнік неаднаразова выказвае ўдзячнасць лёсу, што дазволіў яму быць побач і сябраваць з такімі выбітнымі асобамі.

Найбольш развітыя эсэістычныя адступленні А. Э. Адынца звязаны з постаццю Ігната Ходзькі. Аўтар паядноўвае філаматкія гады з падзеямі пазнейшага часу і паказвае іх агульныя сяброўска-літаратурныя стасункі. У выніку сумесных абмеркаванняў нарадзіліся «Баруны» і «Успаміны квестара» Ходзькі, дзе праўдзіва і дакладна адноўлена традыцыйнае жыццё і побыт патрыярхальнай Літвы-Беларусі, той самы дух і каларыт, што быў паказаны А. Міцкевічам у «Пане Тадэвушы». Прачытаная вечарам аповесць сябра «Домік майго дзядулі» настолькі ўзрушыла Адынца, што ўначы яму прыйшла думка пра неабходнасць напісаць і «Смерць майго дзядулі». Ён выцягнуў з ложка Ходзьку, і сябры да раніцы хадзілі па залітым месяцам садзе і абмяркоўвалі гэты літаратурны праект.

Індывідуальнасць і суб'ектыўнасць мемуарнага твора родніць яго з лірычнымі жанрамі, ліра-эпічнай паэзіяй. Варта адзначыць насычанасць «Успамінаў» вялікай колькасцю ўласных паэтычных твораў А. Э. Адынца – прынагодных, лірычных, вершаў-пасланняў, вершаў-прысвячэнняў, эпітафій, якія праз мастацкія вобразы дапаўняюць чытацкія ўяўленні пра асобы сяброў і звязаныя з імі падзеі. Так, аўтар гаворыць, што ёсць рэчы, непрызначаныя для прозы, як некаторыя непрыдатныя для паэзіі. Уражанні ад філарэцкай маёўкі 1821 г. на Зялёныя Святкі, падчас якой адбылося асабістае знаёмства з А. Міцкевічам, спрычыніліся да напісання праз шмат год верша «Мой плашч», часткова цытаванага аўтарам у мемуарах. Літаратурны характар мемуараў узмацняюць шматлікія спасылкі і цытаты з твораў сяброў-філаматаў, а таксама з Байрана, Шылера, Гётэ, Скота і іншых заходнееўрапейскіх пісьменнікаў. У мемуарах А. Э. Адынца чытач сутыкаецца з цікавай з'явай інтэртэксту ў яго першасным значэнні, як суаднесенасць аднаго тэксту з іншым. Вялікае месца займае і эпісталярны матэрыял, разгорнутыя і змястоўныя фрагменты ліставання з І. Дамейкам, А. Міцкевічам, В. Полем і іншымі літаратарамі.

Момантам свайго выезду з Вільні ў Варшаву пісьменнік спыняе паслядоўную і цэласную плынь успамінаў пра часы філамацкай маладосці і заканчвае мемуары серыяй імянных раздзелаў, паўнавартасных нарысаў, у якіх створаны разгорнутыя літаратурныя партрэты новых знаёмых па Варшаве – К. Брадзінскага, С. Вітвіцкага, С. Гарчынскага, Ю. Б. Залескага, В. Поля. Постаці гэтых выбітных літаратараў таксама вымалёўваюцца праз прызму асабістых, падкрэслена суб'ектыўных уражанняў А. Э. Адынца, атрыманых пад час творчых стасункаў і бытавых эпізодаў сумеснага з імі быцця ў Варшаве і Дрэздэне.

Апавядаючы пра сябе, А. Э. Адынец тым самым апавядае пра блізкіх сяброў і знаёмцаў, трапна і па-мастацку вобразна паказвае іх індывідуалізаваныя аблічча і яркія характары, якімі яны зафіксаваліся ў творчай свядомасці пісьменніка. Багацце факталагічнага матэрыялу і мастацкасць яго адлюстравання, канцэптуальная цэласнасць і эмацыянальна-рэфлексійнае перажыванне гісторыі робяць мемуарна-біяграфічны твор А. Э. Адынца значнай з’явай літаратуры Беларусі XIX стагоддзя.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Адынец, А. Э.* Успаміны пра мінулае / А. Э. Адынец. – Мінск : Лімарыус, 2020. – 360 с.
2. *Хмяльніцкая, Л.* Лёс інсургента : дакументальная аповесць аб Аляксандру Рыпінскім і ягоным часе / Л. Хмяльніцкая. – Мінск : Лімарыус, 2019. – С. 288–288.

*Друкавалася [у] : Бурдзялёва, І. А. Партрэты філаматаў ва «Успамінах» А. Э. Адынца / І. А. Бурдзялёва // Філаматы і філарэты: творчы лёс пакалення ў гісторыі і сучаснасці (да 200-годдзя ўтварэння таварыства) : зб. навук. арт. – Мінск : Бел. навука, 2020. – С 238–250.*